ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________ № ________

**АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ**
**ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ**
(АСВА 1-21 05 01-2021)

**ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ. I СТУПЕНЬ**
**Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)**

**Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)**
**Кваліфікацыя Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і лігаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік**

**Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп’ютарнае забеспячэнне)**
**Кваліфікацыя Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па камп’ютарнай філалогіі**

**Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя)**
**Кваліфікацыя Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі**

**ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ. I СТУПЕНЬ**
**Специальность 1-21 05 01 Белорусская филология (по направлениям)**
**Направление специальности 1-21 05 01-01 Белорусская филология (литературно-редакционная деятельность)**
**Квалификация Филолог. Преподаватель белорусского языка и литературы. Литературно-редакционный сотрудник**

**Направление специальности 1-21 05 01-02 Белорусская филология (компьютерное обеспечение)**
**Квалификация Филолог. Преподаватель белорусского языка и литературы. Специалист по компьютерной филологии**

**Направление специальности 1-21 05 01-03 Белорусская филология (деловая коммуникация)**
**Квалификация Филолог. Преподаватель белорусского языка и литературы. Специалист по деловой коммуникации**

**HIGHER EDUCATION. I STAGE**
**Speciality 1-21 05 01 Belarussian Philology (in directions)**

**Major in 1-21 05 01-01 Belarussian Philology (Literary-Editorial Activity)**
**Qualification Philologist. Teacher of the Belaussian Language and Literature. Literary-Editorial Specialist**

**Major in 1-21 05 01-02 Belarussian Philology (Computer Support)**
**Qualification Philologist. Teacher of the Belarussian Language and Literature. Computer Philology Specialist**

**Major in 1-21 05 01-03 Belarussian Philology (Business Communication)**
**Qualification Philologist. Teacher of the Belarussian Language and Literature. Business Communication Specialist**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) (далей адукацыйны стандарт) прымяняецца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступени, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае – адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі I ступені), вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

Дадзены адукацыйны стандарт абавязковы для выкарыстання ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі, якія здзяйсняюць падрыхтоўку па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках).

2. У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя заканадаўчыя акты:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

СТБ КА 9000-2015 Сістэмы менеджменту якасці. Асноўныя палажэнні і слоўнік (далей – СТБ КА 9000-2015);

Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 011-2009 «Спецыяльнасці і кваліфікацыі» (далей - АКРБ 011-2009);

Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2011 «Віды эканамічнай дзейнасці» (далей - АКРБ 005-2011).

3. У дадзеным адукацыйным стандарце прымяняюцца тэрміны, установленыя ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

базавыя прафесійныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй I ступені і адлюстроўваюць здольнасць вырашаць агульныя задачы прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю;

заліковая адзінка – лічбавы спосаб выражэння працаёмкасці вучэбнай работы студэнта, курсанта, слухача, заснаваны на дасягненні вынікаў навучання;

кваліфікацыя – падрыхтаванасць работніка да прафесійнай дзейнасці пры выкананні работ пэўнай складанасці ў рамках спецыяльнасці, напрамку спецыяльнасці (АКРБ 011-2009);

вынікі навучання – веды, уменні і навыкі (вопыт), якія навучэнец можа прадэманстраваць па завяршэнні вывучэння канкрэтнай вучэбнай дысцыпліны або модуля;

забеспячэнне якасці – частка менеджменту якасці, арыентаваная на прадстаўленне ўпэўненасці, што патрабаванні да якасці будуць выкананы (СТБ 180 9000-2015);

кампетэнтнасць – здольнасць прымяняць веды і навыкі для дасягнення мяркуемых вынікаў (СТБ 180 9000-2015);

кампетэнцыя – веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных залач;

літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, уменняў і кампетэнцый у літаратурна-рэдакцыйнай сферы;

літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік – прафесійная кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй у галіне літаратурна-рэдакцыйнай дзейнасці;

модуль – адносна адасобленая, лагічна завершаная частка адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае фарміраванне пэўнай кампетэнцыі (групы кампетэнцый);

спецыялізаваныя кампетэнцыі - кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй I ступені і якія адлюстроўваюць здольнасць вырашаць спецыялізаваныя задачы прафесійнай дзейнасці з улікам накіраванасці адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ва ўстанове вышэйшай адукацыі;

спецыяльнасць – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, навыкаў і кампетэнцый, набытых шляхам навучання і практычнага вопыту, – падсістэма групы спецыяльнасцей (АКРБ 011-2009);

універсальныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй I ступені і якія адлюстроўваюць здольнасць прымяняць базавыя агульнакультурныя веды і ўменні, а таксама сацыяльна-асобасныя якасці ў адпаведнасці з патрэбамі дзяржавы і грамадства;

беларуская філалогія – навука аб беларускай мове і літаратуры;

філолаг – прафесійная кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай адукацыяй у галіне філалогіі;

філалогія – навука аб мовах і літаратурах.

дзелавая камунікацыя – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, уменняў і кампетэнцый у галіне дзелавой камунікацыі, дзелавога этыкету і дзелавой культуры;

4. Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) у адпаведнасці з АКРБ 011-2009 адносіцца да профілю адукацыі D «Гуманітарныя навукі», напрамку адукацыі 21 «Гуманітарныя навукі».

У адпаведнасці з АКРБ 011-2009 па спецыяльнасці прадугледжаны напрамкі спецыяльнасці:

1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік»;

1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп’ютарнае забеспячэнне), які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па камп’ютарнай філалогіі»;

1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя), які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі»;

5. Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) адносіцца да ўзроўню 6 Нацыянальнай рамкі кваліфікацый вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ АСНОЎНАЙ АДУКАЦЫІ АСОБ, ЯКІЯ ПАСТУПАЮЦЬ ДЛЯ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ І СТУПЕНІ, ФОРМ І ТЭРМІНАЎ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАГА АДУКАЦЫІ І СТУПЕНІ

6. На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю або прафесійна-тэхнічную адукацыю з агульнай сярэдняй адукацыяй або сярэднюю спецыяльную адукацыю, пацверджаную адпаведным дакументам аб адукацыі.

Прыём асоб для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ажыццяўляецца на падставе пункта 9 артыкула 57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і ў адпаведнасці з Правіламі, зацверджанымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

7. Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы атрымання вышэйшай адукацыі І ступені:

− вочная (дзённая, вячэрняя);

– завочная (у тым ліку дыстанцыйная).

8. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ў дзённай форме складае 4 гады.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў вячэрняй форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў завочнай форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў дыстанцыйнай форме складае 5 гадоў.

9. Пералік спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы, па якіх могуць быць інтэграваныя з адукацыйнай праграмай вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках), вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) асобамі, якія навучаюцца па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, можа быць скарочаны ўстановай вышэйшай адукацыі пры ўмове захавання патрабаванняў гэтага адукацыйнага стандарту ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Тэрмін навучання па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у вячэрняй і завочнай (у тым ліку дыстанцыйнай) формах можа быць павялічаны не больш чым на 1 год адносна тэрміну навучання па дадзенай адукацыйнай праграме ў дзённай форме.

10. Пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане незалежна ад формы атрымання адукацыі тэрмін навучання ўстанаўліваецца самастойна ўстановай вышэйшай адукацыі, але не большы за тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі I ступені, устаноўлены для адпаведнай формы атрымання адукацыі.

Пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ўстанова вышэйшай адукацыі мае права падоўжыць тэрмін не больш чым на 1 год у параўнанні з тэрмінам, устаноўленым для адпаведнай формы атрымання адукацыі.

11. Агульны аб'ём адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені складае 240 заліковых адзінак.

11. Сума заліковых адзінак за 1 год навучання пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў дзённай форме складае 60 заліковых адзінак, пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане – не больш за 75 заліковых адзінак. Пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і

дыстанцыйнай формах сума заліковых адзінак за 1 год навучання, як правіла, не перавышае 60 заліковых адзінак.

## ГЛАВА 3
## ПАТРАБАВАННІ ДА ЗМЕСТУ ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА З ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫЯЙ

12. Асноўнымі відамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з вышэйшай адукацыяй (далей – спецыяліст) у адпаведнасці з АКРБ 005-2011 з’яўляюцца:

− 58 Выдавецкая дзейнасць;

− 60 Дзейнасць у галіне радыёвяшчання і тэлебачання;

− 72 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі;

− 91 Дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры;

− 639 Дзейнасць інфармацыйных агенцтваў;

− 853 Сярэдняя адукацыя;

− 854 Вышэйшая адукацыя.

Спецыяліст можа ажыццяўляць іншыя віды прафесійнай дзейнасці пры ўмове адпаведнасці ўзроўню яго адукацыі і набытых кампетэнцый патрабаванням да кваліфікацыі работніка.

13. Аб’ектамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з’яўляюцца навукова-даследчыя і педагагічныя працэсы, адукацыйныя сістэмы.

14. Спецыяліст можа вырашаць задачы прафесійнай дзейнасці наступных тыпаў:

навукова-даследчыя:

навукова-даследчая дзейнасць у складзе групы;

удзел у падрыхтоўцы навуковых справаздач, аглядаў, публікацый, патэнтаў,

арганізацыі канферэнцый;

падрыхтоўка аб’ектаў і засваенне метадаў даследавання;

работа з даведачнымі сістэмамі, пошук і апрацоўка навуковай інфармацыі;

складанне навуковых дакладаў і бібліяграфічных спісаў па зададзенай тэме.

адукацыйныя:

ажыццяўленне філалагічнага навучання і выхавання ў сферы прафесійнай дзейнасці.

педагагічныя:

выкладанне філалагічных дысцыплін ва ўстановах агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых.

навукова-метадычныя:

удзел у падрыхтоўцы навуковай і вучэбнай літаратуры, распрацоўцы вучэбна-метадычнай і навуковай дакументацыі для забеспячэння выкладання філалагічных дысцыплін.

інавацыйныя:

распрацоўка і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій.

## ГЛАВА 4
## ПАТРАБАВАННІ ДА КАМПЕТЭНТНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА

15. Спецыяліст, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках), павінен валодаць універсальнымі, базавымі прафесійнымі і спецыялізаванымі кампетэнцыямі.

Універсальныя, базавыя прафесійныя і спецыялізаваныя кампетэнцыі вызначаюцца з улікам Нацыянальнай рамкі кваліфікацый вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

16. Спецыяліст, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, павінен валодаць наступнымі ўніверсальнымі кампетэнцыямі (далей – УК):

УК-1. Валодаць асновамі даследчыцкай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі;

УК-2. Вырашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове ўжывання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

УК-3. Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове для рашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння;

УК-4. Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці;

УК-6. Праяўляць ініцыятыву і адаптоўвацца да змен у прафесійнай дзейнасці;

УК-7. Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму;

УК-8. Валодаць сучаснай культурай мыслення, выкарыстоўваць асновы філасофскіх ведаў у прафесійнай дзейнасці;

УК-9. Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей;

17. Спецыяліст, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, павінен валодаць наступнымі базавымі прафесійнымі кампетэнцыямі (далей – БПК):

БПК-1. Ведаць і разумець арганізацыю сістэмы сучаснай беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях і правілы функцыянавання адзінак беларускай мовы ў маўленні.

БПК-2. Характарызаваць адзінкі беларускай мовы з пункту гледжання іх семантыкі, структуры, функцыі, нарматыўнасці;

БПК-3. Ажыццяўляць паўзроўневы лінгвістычны аналіз беларускамоўнага тэксту;

БПК-4. Валодаць навыкамі выкарыстання рэсурсаў беларускай мовы ў вуснай і пісьмовай формах у маўленні, ажыццяўлення моўнага ўзаемадзеяння ў розных сітуацыях зносін;

БПК-5. Растлумачваць заканамернасці гістарычнага развіцця фанетычнага, марфалагічнага, сінтаксічнага ладу беларускай мовы;

БПК-6. Характарызаваць этапы фарміравання беларускай літаратурнай мовы як вышэйшай формы існавання нацыянальнай мовы;

БПК-7. Выяўляць і аналізаваць дыялектныя асаблівасці ў маўленні носьбітаў беларускай мовы;

БПК-8. Валодаць ведамі аб нормах сучаснай беларускай літаратурнай мовы і дынаміцы нормаў;

БПК-9. Ведаць літаратурны працэс і арыентавацца ў ім, характарызаваць розныя этапы развіцця беларускай літаратуры, яе асноўныя напрамкі, плыні і мастацкія метады;

БПК-10. Характарызаваць мастацкі тэкст з пункту гледжання яго аўтарства і суаднесенасці з літаратурным кірункам, школай, працаваць з тэкстам мастацкага твора з выкарыстаннем методык аналізу і інтэрпрэтацыі;

БПК-11. Выяўляць і аналізаваць філасофскія, рэлігійныя, гісторыка-культурныя, палітычныя і іншыя ідэі і канцэпцыі, якія знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творах беларускай літаратуры;

БПК-12. Прымяняць веды аб дасягненнях філалагічных дысцыплін, якія вывучаюць матэрыяльную і духоўную культуру славянскіх народаў, у прафесійнай дзейнасці;

БПК-13. Характарызаваць семіятычную канцэпцыю мовы, аспекты плана зместу моўнага знака, узаемадзеянне і карэляцыю ўзроўняў моўнай структуры, функцыі мовы і гаворкі;

БПК-14. Характарызаваць сістэму літаратуразнаўчых дысцыплін у іх сувязях з іншымі гуманітарнымі навукамі і дапаможнымі галінамі літаратуразнаўства, разглядаць літаратурны твор у арганічным адзінстве яго зместу і формы;

БПК-15. Выкарыстоўваць эфектыўныя сродкі і метады навучання беларускай мове, рэалізоўваць розныя формы арганізацыі навучання і кантролю ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;

БПК-16. Выкарыстоўваць эфектыўныя сродкі і метады навучання беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, праводзіць метадычна арыентаваны аналіз літаратурных твораў і з’яў літаратурнага працэсу, валодаць тэхналогіяй сучаснага ўрока літаратуры;

БПК-17. Ажыццяўляць аналіз крыніц інфармацыі, вылучаць найбольш істотныя факты, выкарыстоўваць на практыцы катэгарыяльна-паняційны апарат, прыняты ў прафесійным асяродку;

БПК-18. Праектаваць і рэалізоўваць працэс навучання і выхавання з апорай на сучасныя педагагічныя веды;

БПК-19. Вызначаць прычыны псіхалагічных станаў і спосабы кіравання імі для эфектыўнага ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

БПК-20. Ужываць асноўныя метады абароны насельніцтва ад негатыўных уздзеянняў фактараў антрапагеннага, тэхнагеннага, натуральнага паходжання, прынцыпы рацыянальнага прыродакарыстання і энергазахавання, забяспечваць здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

18. Пры распрацоўцы адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені на аснове гэтага адукацыйнага стандарту ўсе УК і БПК уключаюцца ў набор патрабуемых вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені ў адпаведнасці з гэтым адукацыйным стандартам.

Пералік вызначаных гэтым адукацыйным стандартам УК можа быць дапоўнены ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам скіраванасці адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

Пералік спецыялізаваных кампетэнцый установа вышэйшай адукацыі вызначае самастойна з улікам скіраванасці адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

Дадатковыя УК і спецыялізаваныя кампетэнцыі вызначаюцца на аснове патрабаванняў рынка працы, абагульненні замежнага вопыту, правядзенні кансультацый з вядучымі працадаўцамі, аб'яднаннямі працадаўцаў адпаведнай галіны, іншых крыніц.

Сукупнасць вызначаных гэтым адукацыйным стандартам УК і БПК, а таксама вызначаных установай вышэйшай адукацыі дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, павінна забяспечваць спецыялісту здольнасць ажыццяўляць не адзін від прафесійнай дзейнасці, вырашаючы пры гэтым не менш аднаго тыпу задач прафесійнай дзейнасці, адзначаных у пунктах 12 і 14 гэтага адукацыйнага стандарту.

# ГЛАВА 5
# ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧЭБНА-ПРАГРАМНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ І СТУПЕНІ

19. Адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі І ступені ўключае наступную вучэбна-праграмную дакументацыю:

тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці);

вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці);

тыпавыя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах;

вучэбныя праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах;

праграмы практык.

20. Максімальны аб'ём вучэбнай нагрузкі навучэнца не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны на тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай работы.

Аб'ём абавязковых аўдыторных заняткаў, вызначаны ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці, спецыфікі арганізацыі адукацыйнага працэсу, аснашчэння вучэбна-лабараторнай базы, інфармацыйнага, навукова-метадычнага забеспячэння, усталёўваецца ў межах 24-32 аўдыторных гадзін на тыдзень.

У гадзіны, што адводзяцца на самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне (модулі), уключаецца час, прадугледжаны на падрыхтоўку да экзамену (экзаменаў) і (або) заліку (залікаў) па дадзенай вучэбнай дысцыпліне (модулі).

21. Вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, пададзенай у табліцы 1.

Табліца 1

| № п/п | Назва відаў дзейнасці навучэнца, модуляў | Працаёмкасць (у заліковых адзінках) |
|---|---|---|
| **1.** | **Тэарэтычнае навучанне** | **180-210** |
| 1.1. | Дзяржаўны кампанент: «Сацыяльна-гуманітарны модуль-1», модуль «Сучасная беларуская мова», модуль «Гісторыя беларускай мовы», модуль «Гісторыя беларускай літаратуры», «Прапедэўтычны модуль», «Метадычны модуль», «Лінгвістычны модуль», «Псіхолага-педагагічны модуль», модуль «Курсавыя работы» | 70-131 |
| 1.2. | Кампанент установы вышэйшай адукацыі | 70-131 |

| №<br>п/п | Назва відаў дзейнасці навучэнца, модуляў | Працаёмкасць<br>(у заліковых адзінках) |
|---|---|---|
| 1.3. | Факультатыўныя дысцыпліны | |
| 1.4. | Дадатковыя віды навучання | |
| **2.** | **Вучэбная практыка** | **7-15** |
| **3.** | **Вытворчая практыка** | **15-20** |
| **4.** | **Дыпломнае праектаванне** | **1-15** |
| | **Усяго** | **240** |

22. Размеркаванне працаёмкасці паміж асобнымі модулямі і вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента, а таксама асобнымі відамі вучэбных і вытворчых практык ажыццяўляецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

23. Назвы вучэбных і вытворчых практык вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам асаблівасцей прафесійнай дзейнасці спецыяліста.

У вучэбным плане ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) неабходна прадугледзець праходжанне вучэбнай (азнаямляльнай) практыкі на першым курсе навучання.

24. Працаёмкасць кожнай вучэбнай дысцыпліны павінна складаць не менш за тры заліковыя адзінкі. Адпаведна, працаёмкасць кожнага модуля павінна складаць не менш за шэсць балаў.

25. Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) рэкамендуецца прадугледжваць у рамках кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі модулі і вучэбныя дысцыпліны на выбар навучэнца ў аб'ёме не менш чым 15 працэнтаў ад агульнага аб'ёму тэарэтычнага навучання.

26. Коды УК і БПК, фарміраванне якіх забяспечваюць модулі і вучэбныя дысцыпліны дзяржаўнага кампанента, пазначаны ў табліцы 2.

Табліца 2

| №<br>п/п | Назвы модуляў, вучэбных дысцыплін | Коды фарміруемых кампетенций |
|---|---|---|
| 1.1 | Сацыяльна-гуманітарны модуль-1 | |
| 1.1.1 | Гісторыя | УК-9 |
| 1.1.2 | Паліталогія | УК-4,7 |
| 1.1.3 | Эканоміка | УК-1 |
| 1.1.4 | Філасофія | УК-8 |
| 1.2 | Модуль «Сучасная беларуская мова» | БПК-1-4 |
| 1.2.1 | Фанетыка | |
| 1.2.2 | Лексікалогія. Фразеалогія | |
| 1.2.3 | Словаўтварэнне | |
| 1.2.4 | Марфалогія | |
| 1.2.5 | Сінтаксіс | |
| 1.2.6 | Стылістыка і культура маўлення беларускай мовы | БПК-4, 8 |

| №<br>п/п | Назвы модуляў, вучэбных дысцыплін | Коды фарміруемых компетенций |
|---|---|---|
| 1.3 | Модуль «Гісторыя беларускай мовы» | |
| 1.3.1 | Гістарычная граматыка беларускай мовы | БПК-5 |
| 1.3.2 | Гісторыя беларускай літаратурнай мовы | БПК-6 |
| 1.3.3 | Беларуская дыялекталогія | БПК-7 |
| 1.3.4 | Гісторыя беларускага мовазнаўства | БПК-1 |
| 1.4 | Модуль «Гісторыя беларускай літаратуры» | БПК-8-10 |
| 1.4.1 | Гісторыя беларускай літаратуры XI-XVII стст. | |
| 1.4.2 | Гісторыя беларускай літаратуры XVIII-п. п. XIXст. | |
| 1.4.3 | Гісторыя беларускай літаратуры др. пал. XIX ст. | |
| 1.4.4 | Гісторыя беларускай літаратуры пачатку XX ст. | |
| 1.4.5 | Гісторыя беларускай літарат. XX ст. (1920-30-я г.) | |
| 1.4.6 | Гісторыя беларускай літарат. XX ст. (1940-80-я г.) | |
| 1.4.7 | Гісторыя беларуск. літар. канца XX - пач. XXI ст. | |
| 1.5 | Прапедэўтычны модуль | |
| 1.5.1 | Уводзіны ў мовазнаўства | БПК-13 |
| 1.5.2 | Уводзіны ў літаратуразнаўства | БПК-14 |
| 1.5.3 | Уводзіны ў славянскую філалогію | БПК-12 |
| 1.6 | Метадычны модуль | |
| 1.6.1 | Методыка выкладання беларускай мовы | БПК-15 |
| 1.6.2 | Методыка выкладання беларускай літаратуры | БПК-16 |
| 1.7 | Лінгвістычны модуль | УК-3 |
| 1.7.1 | Замежная мова | |
| 1.8 | Псіхолага-педагагічны модуль | |
| 1.8.1 | Педагогіка | УК-6, БПК-18 |
| 1.8.2 | Псіхалогія | УК-5, БПК-19 |
| 1.9 | Модуль «Курсавыя работы» | УК-1,2, БПК-17 |
| 1.9.1 | Курсавая работа 1 | |
| 1.9.2 | Курсавая работа 2 | |
| 1.9.3 | Курсавая работа 3 | |

27. Вынікі навучання па модулях і вучэбных дысцыплінах дзяржаўнага кампанента (ведаць, умець, валодаць) вызначаюцца вучэбнымі праграмамі.

28. Вынікі навучання па модулях і вучэбных дысцыплінах кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі, практыках, дыпломным праектаванні ўстанова вышэйшай адукацыі плануе самастойна. Установа вышэйшай адукацыі таксама можа канкрэтызаваць і дапаўняць вынікі навучання па модулях і вучэбных дысцыплінах дзяржаўнага кампанента, устаноўленыя тыпавымі вучэбнымі праграмамі па вучэбных дысцыплінах.

29. Вынікі навучання павінны быць суаднесены з патрабаванымі вынікамі засваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені (кампетэнцыямі).

30. Сукупнасць запланаваных вынікаў навучання павінна забяспечваць выпускніку фарміраванне ўсіх УК і БПК, вызначаных

дадзеным адукацыйным стандартам, а таксама ўсіх дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, вызначаных установай вышэйшай адукацыі самастойна.

## ГЛАВА 6
## ПАТРАБАВАННІ ДА АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

31. Педагагічныя работнікі ўстановы вышэйшай адукацыі павінны:

займацца навукова-метадычнай дзейнасцю;

валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу на належным узроўні;

валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыямі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу са студэнтамі, курсантамі, слухачамі.

Для ажыццяўлення адукацыйнага працэсу могуць прыцягвацца спецыялісты рэальнага сектара эканомікі, дзейнасць якіх звязана са спецыяльнасцю вышэйшай адукацыі I ступені, у адпаведнасці з заканадаўствам.

32. Установа вышэйшай адукацыі павінна валодаць:

матэрыяльна-тэхнічнай базай, неабходнай для арганізацыі адукацыйнага працэсу, самастойнай работы і развіцця асобы студэнта, курсанта, слухача;

сродкамі навучання, неабходнымі для рэалізацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені (прылады, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп’ютары, камп’ютарныя сеткі, аўдыявізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб'екты).

Функцыянаванне інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя ўстановы вышэйшай адукацыі забяспечваецца адпаведнымі сродкамі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і павінна адпавядаць заканадаўству.

Навучэнцы з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця павінны быць забяспечаны адаптаванымі друкаванымі і (або) электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі.

У выпадку прымянення дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій дапускаецца замена спецыяльна абсталяваных памяшканняў іх віртуальнымі аналагамі, якія дазваляюць навучэнцам набыць кампетэнцыі, вызначаныя ў главе 4 дадзенага адукацыйнага стандарту.

33. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

вучэбныя дысцыпліны (модулі) павінны быць забяспечаны сучаснай вучэбнай, даведачнай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі,

вучэбна- метадычнай дакументацыяй, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі, у тым ліку ў электронным выглядзе;

павінен быць забяспечаны доступ для кожнага студэнта, курсанта, слухача да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах (модулях).

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (крэатыўнага і дыялогавага навучання, варыятыўных мадэляў самастойнай працы, модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэньвання ўзроўню кампетэнцый і інш.).

Абавязковым элементам навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу з'яўляецца размешчаны на афіцыйным сайце ўстановы вышэйшай адукацыі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт каталог вучэбных дысцыплін (модуляў), які адпавядае наступным патрабаванням:

змяшчае зручную ў выкарыстанні і актуальную інфармацыю, даступную для абітурыентаў на этапе ўступнай кампаніі, а таксама для студэнтаў, курсантаў, слухачоў на працягу ўсяго перыяду навучання;

прапаноўваецца на беларускай і (або) рускай мове і англійскай мове;

апісанне кожнай вучэбнай дысцыпліны (модуля) змяшчае кароткі змест, неабходныя кампетэнцыі, вынікі навучання (ведаць, умець, валодаць), семестр, прэрэквізіты, працаёмкасць ў заліковых адзінках (крэдытах), колькасць аўдыторных гадзін і самастойнай работы, патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі;

аб'ём апісання вучэбнай дысцыпліны (модуля) складае максімум адну старонку;

каталог навучальных дысцыплін (модуляў) суправаджаецца структурнай схемай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені з заліковымі адзінкамі.

Установы вышэйшай адукацыі маюць права самастойна прымаць рашэнне аб фармаце каталога вучэбных дысцыплін (модуляў) і паслядоўнасці падачы інфармацыі.

34. Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы вызначаюцца заканадаўствам.

35. Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы вызначаюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна-планавай дакументацыяй выхавання.

36. Канкрэтныя формы і працэдуры прамежкавага кантролю ведаў навучэнцаў па кожнай вучэбнай дысцыпліне распрацоўваюцца адпаведнай

кафедрай установы вышэйшай адукацыі і адлюстроўваюцца ў вучэбных праграмах установы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах.

37. Для атэстацыі навучэнцаў на адпаведнасць іх персанальных дасягненняў паэтапным або канчатковым патрабаванням адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыпавыя заданні, заданні адкрытага тыпу, заданні камунікатыўнага тыпу, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых праектаў (курсавых работ), метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы складання эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый навучэнцаў і інш. Фонды ацэначных сродкаў распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

38. Ацэначнымі сродкамі павінна прадугледжвацца ацэнка здольнасці навучэнцаў да творчай дзейнасці, іх падрыхтоўкі праводзіць пошук вырашэння новых задач, звязаных з недастатковасцю канкрэтных спецыяльных ведаў і адсутнасцю агульнапрынятых алгарытмаў.

## ГЛАВА 7
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКОВАЙ АТЭСТАЦЫІ

39. Выніковая атэстацыя ажыццяўляецца дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

Да выніковай атэстацыі дапускаюцца студэнты, курсанты, слухачы, якія цалкам выканалі адпаведныя навучальны план і навучальныя праграмы.

Выніковая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) праводзіцца ў форме дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці, напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі і абароны дыпломнай работы.

Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцы 2 дадзенага адукацыйнага стандарту.

40. Праграма дзяржаўнага экзамену распрацоўваецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

41. Патрабаванні да структуры, зместу, аб’ёму і парадку абароны дыпломнай работы вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на аснове дадзенага адукацыйнага стандарту і Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Тэматыка дыпломных работ павінна вызначацца актуальнасцю і практычнай значнасцю.

Кіраўнікі распрацоўкі адукацыйнага стандарту

Кіраўнік калектыву распрацоўшчыкаў ________________ М. Р. Прыгодзіч
*подпіс*

___ ___________2021

Старшыня ВМА ________________ А. М. Здрок
па гуманітарнай адукацыі *подпіс*
М.П.

___ ___________2021

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ________________ А. Д. Кароль
ўніверсітэта *подпіс*
М.П.

"___"___________2021 г.

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь

____________________ І. А. Старавойтава
*подпіс*
М. П.
___ ___________2021

ЭКСПЕРТЫ:
Загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

____________________ Д. В. Дзятко
*Подпіс*
М. П.
___ ___________2021

Рэктар дзяржаўнай УА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

Ю. П. Бондар
____________________
*подпіс* М. П.
___ ___________2021